# Падзеі Першай сусветнай вайны на беларускіх землях

## Гісторыя Беларусі, IX клас

**В. Д. Ермакова,** настаўнік Прыборскага дзіцячага сада — сярэдняй школы Гомельскага раёна

**Мэта:** пазнаёміць вучняў з падзеямі Першай сусветнай вайны на беларускіх землях.

**Задачы**

**1.** Вучні павінны ведаць даты гістарычных падзей, звязаных з пачаткам вайны, увядзеннем ваеннага становішча і ходам ваенных дзеянняў на тэрыторыі Беларусі падчас Першай сусветнай вайны; характарызаваць германскі акупацыйны рэжым у Заходняй Беларусі; тлумачыць прычыны ўрапатрыятычных настрояў часткі беларускага грамадства ў пачатку вайны і расчаравання ў 1915 г.; тлумачыць узаемасувязь паміж германскай акупацыйнай палітыкай і спробамі стварэння беларускай дзяржавы; характарызаваць асаблівасці фарміравання беларускай нацыі і яе нацыянальнай ідэі.

**2.** Стварыць умовы для замацавання і развіцця ўменняў працаваць з тэкстам падручніка і дакументамі; тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі; выказваць свае адносіны да гістарычных з'яў і фактаў; працаваць з картамі, ілюстрацыямі і г. д.

**3.** Садзейнічаць фарміраванню ў вучняў непрымірымых адносін да вайны як сродку вырашэння міжнародных спрэчак, пераканання ў неабходнасці іх вырашэння мірным шляхам.

**Абсталяванне:** Гісторыя Беларусі канец XVIII — пачатак XX ст.: вучэб. дапам. для 8 кл.; карта «Беларусь у гады Першай сусветнай вайны»; атлас «Гісторыя Беларусі: канец XVIII — пачатак XX ст.», 9 кл.; раздатачны матэрыял.

**Тып урока:** урок вывучэння новага матэрыялу.

**Афармленне класнай дошкі:** запісаны тэма ўрока, новыя паняцці *(мабілізацыя, «Свянцянскі прарыў», акупацыя)*; імёны гістарычных асоб (Мікалай Аляксандравіч Бржазоўскі, Платон Аляксеевіч Лячынскі, Пётр Іванавіч Казятнікаў, Антон Луцкевіч, Вацлаў Ластоўскі); план вывучэння новага матэрыялу, дамашняе заданне.

**План**

1. Пачатак вайны. Баявыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі.
2. Ураджэнцы Беларусі — героі Першай сусветнай вайны.
3. Акупацыя заходняй часткі Беларусі.
4. Палітыка германскіх акупацыйных улад на акупіраванай тэрыторыі.
5. Становішча насельніцтва. Беларускі нацыянальны рух.

### Ход урока

***I. Арганізацыйны момант.***

**Настаўнік.** 11 лістапада 2018 г. споўнілася 100 гадоў з дня заканчэння Першай сусветнай вайны. Вайны, якая забрала звыш 9 мільёнаў жыццяў і ў якой удзельнічала звыш 70 мільёнаў чалавек. Галандскі гуманіст Эразм Ратэрдамскі пісаў: «Вайна — першапрычына ўсіх бед і зол, бяздонны акіян, які паглынае ўсё без разбору». Сёння на ўроку мы разгледзім падзеі

Першай сусветнай вайны на беларускіх землях і вызначым, якія беды прынесла яна нашаму народу і роднай зямлі.

***II. Актуалізацыя ведаў.***

— Узгадайце прычыны і характар Першай сусветнай вайны. Калі Расійская імперыя ўступіла ў вайну? *(Адказы.)*

***III. Вывучэнне новага матэрыялу.***

— 1 жніўня 1914 г. беларускія губерні былі пераведзены на ваеннае становішча. Як гэта мера паўплывала на становішча ў Беларусі? Прачытайце першы пункт § 27 і адкажыце на гэта пытанне. У гістарычным слоўніку знайдзіце азначэнне слова *мабілізацыя* і запішыце гэта паняцце ў сшытак. *(Адказы.)*

Заданне 1. Параўнайце адносіны да вайны розных палітычных партый і газеты «Наша ніва». Крытэрыі для параўнання складзіце самастойна ў парах. Можна выкарыстаць карткі *(Дадатак 1)*.

— Прачытайце словы Янкі Купалы з верша «1914» і выкажыце сваё меркаванне. Ці сугучны гэтыя словы з выказваннем Эразма Ратэрдамскага?

**Баявыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі**

Заданне 2. Прачытайце пункт «Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі. Акупацыя заходняй часткі Беларусі». Ахарактарызуйце падзеі Першай сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі і яе становішча з апорай на картасхему «Беларусь у гады Першай сусветнай вайны» (с. 126). Вызначце асноўныя ваенныя аперацыі і даты іх правядзення. Адкажыце на пытанні: «Якія былі прычыны змены настрояў беларускага грамадства ў пачатку вайны і ў 1915 г.? Што такое акупацыя?». Для адказу выкарыстайце гістарычны слоўнік. Прывядзіце прыклады гераізму і мужнасці. *(Абарона Смаргоні цягнулася 810 дзён. Тут немцы ўпершыню на Усходнім фронце выкарысталі атрутны газ.)*

Вучні разглядаюць скульптурную кампазіцыю «Салдаты Першай сусветнай вайны ў Смаргоні».

**Ураджэнцы Беларусі — героі Першай сусветнай вайны**

Паведамленні вучняў аб М. А. Бржазоўскім, П. А. Лячыцкім, П. І. Казятнікаве. Звярнаецца ўвага на фотаздымкі, с. 127.

Мы ўжо ведаем, што германскія войскі захапілі заходнюю частку Беларусі, дзе пражывала да вайны 2 мільёны чалавек. Зараз прачытайце пункт «Палітыка германскіх улад на акупіраванай тэрыторыі. Становішча насельніцтва Заходняй Беларусі». Складзіце ментальную карту *(Дадатак 2)*. Пазнаёмцеся з інфармацыяй на с. 130.

**Усходняя частка Беларусі ва ўмовах Першай сусветнай вайны. Бежанства**

Вучні працуюць у групах.

Заданне для 1-й групы. Ахарактарызуйце становішча насельніцтва Беларусі з апорай на фотаздымкі «Бежанцы», «Лагер бежанцаў у Слуцку» (с. 128).

Заданне для 2-й групы. Прачытайце дакумент (с. 129). Разгледзьце фотаздымак «Санітарныя павозкі ў Мінску» і адкажыце на пытанне: «Які вывад можна зрабіць на аснове дакумента і фотаздымка?».

**Беларускі нацыянальны рух**

Настаўнік тлумачыць матэрыял. Вучні запаўняюць у сшытках табліцу «Праекты ўтварэння беларускай дзяржаўнасці» (с. 131 падручніка) і адказваюць на пытанне: «Чаму было немагчыма ажыццявіць ідэю адраджэння ВКЛ на акупіраванай германскімі войскамі заходнебеларускай тэрыторыі?». *(Адказы.)*

***IV. Замацаванне вывучанага матэрыялу.***

— Праверым, як вы засвоілі новы матэрыял. Для гэтага мы выкарыстаем гульню «Крыжыкі-нулікі» і выканаем заданне. Перад вамі ляжаць раскрэсленыя аркушы, у якіх вы будзеце запісваць свае адказы. Калі вы адказваеце «так», пастаўце крыжык, калі «не» — нулік.



gisdapamoga.bspu.by

**Гульня «Крыжыкі-нулікі»**

**1.** 1 жніўня 1914 г. — пачатак Першай сусветнай вайны. Увядзенне ваеннага становішча на тэрыторыі Беларусі. *(Так.)*

**2.** Акупацыя — захоп войскамі адной дзяржавы тэрыторыі (або часткі тэрыторыі) іншай дзяржавы з усталяваннем уласных адміністрацыі і законаў. *(Так.)*

**3.** У 1915 г. лінія фронту праходзіла праз Дзвінск — Паставы — Смаргонь — Баранавічы — Пінск. *(Так.)*

**4.** Стаўка Вярхоўнага Галоўнакамандуючага была перанесена з Баранавіч у Мінск. *(Не.)*

**5.** Абарона Смаргоні працягвалася 810 дзён. *(Так.)*

**6.** У час акупацыі насельніцтва ва ўзросце ад 16 да 60 гадоў плаціла падушны падатак. *(Так.)*

**7.** Эсэры і меншавікі выступалі супраць вайны. *(Не.)*

**8.** У планы Германіі не ўваходзіла стварэнне незалежнай Беларуска-Літоўскай дзяржавы. *(Так.)*

**9.** Вацлаў Ластоўскі выступіў на Міжнароднай канферэнцыі ў Лазане з ідэяй стварэння саюзу незалежных дзяржаў. *(Так.)*

**10.** Самаправерка па ключы, адказы на дошцы, зваротны бок.

| | | |
|---|---|---|
| 1.+ | 2.+ | 3.+ |
| 4. 0 | 5.+ | 6.+ |
| 7. 0 | 8.+ | 9.+ |

— Суаднясіце ваенныя аперацыі і даты:

1. Свянцянскі прарыў;
2. Нарачанская аперацыя;
3. Баранавіцкая аперацыя.

а) 19.06 — 16.07.1916;
б) 27.08 — 19.09.1915;
в) 05.03 — 15.03.1916.

Адказы: 1 — б, 2 — в, 3 — а.

— Растлумачце прычынна-выніковую сувязь паміж наступнымі гістарычнымі фактамі:

увядзенне ваеннага становішча — мабілізацыя;

фарміраванне беларускай нацыі — афармленне нацыянальнай ідэі беларусаў.

***V. Рэфлексія. Падвядзенне вынікаў работы.***

— Выкажыце сваё меркаванне. Матэрыял, які мы разгледзелі на ўроку, можа пацвердзіць словы Э. Ратэрдамскага: «Вайна — першапрычына ўсіх бед і зол, бяздонны акіян, які паглынае ўсё без разбору».

— Адкажыце на пытанні: «Чаму людзі павінны выступаць супраць войн і берагчы мір?», «Што я зразумеў/ла на ўроку і што асабліва мне запомнілася?». *(Адказы.)*

Настаўнік выстаўляе адзнакі і каменціруе іх.

**Дамашняе заданне:** § 27. Адкажыце на пытанні (с. 131). Падрыхтуйце паведамленне пра ўдзел нашых землякоў у Першай сусветнай вайне.

*Дадатак 1*

| Партыі, газета «Наша ніва» | Падтрымлівалі вайну | Выступілі супраць вайны |
|---|---|---|
| Акцябрысты | | |
| Кадэты | | |
| Бундаўцы | | |
| Эсэры | | |
| Меншавікі | | |
| Бальшавікі | | |
| «Наша ніва» | | |

gisdapamoga.bspu.by

*Дадатак 2*




gisdapamoga.bspu.by